**І. Р. КАЗАЧЭНКА**,
настаўнік-метадыст
Лельчыцкай раённай гімназіі імя І. А. Коласа

# ВЫКАРЫСТАННЕ ВІДЭАКАНТЭНТУ на ўроках беларускай мовы і літаратуры

Для падвышэння цікавасці і матывацыі навучэнцаў сёння на ўроках неабходна выкарыстоўваць не толькі тэксты, але і больш яркія візуальныя кампаненты — відэаролікі. Сярод задач, вырашаць якія дапамагае навучальнае відэа, — тлумачэнне новых паняццяў, прэзентацыя і ілюстрацыя матэрыялу. Гэтаму садзейнічае нагляднасць, выкарыстанне розных каналаў перадачы інфармацыі (выяў, аўдыязапісаў і тэксту). Відэа дае магчымасць надаць аповеду дынаміку, займальнасць, узмацніць эмацыянальныя акцэнты, стварыць яскравыя, запамінальныя вобразы. Паказ відэаролікаў — адзін з дзейсных прыёмаў візуалізацыі пры праектаванні і правядзенні ўрока. У час прагляду ў класе ўзнікае атмасфера агульнай зацікаўленасці, вучні праяўляюць пазнавальную актыўнасць, жаданне працаваць.

Анімацыя — вельмі перспектыўны напрамак у навучанні, заснаваны на прынцыпе «Пакажы, а не гавары». Часам лепш паказаць вучням пэўны матэрыял, чым патраціць шмат часу на тлумачэнне, паколькі, у адрозненне ад тэксту, відэа адразу дэманструе вобраз. Трэба прадумана і дарэчна скарыстоўваць такі від кантэнту, улічваць яго спецыфіку і магчымасці. Раім прапаноўваць вучням відэаілюстрацыі пры вывучэнні літаратурных твораў, чытанні мастацкага тэксту, тлумачэнні незразумелых слоў (тых, што выйшлі са штодзённага ўжытку або малаўжывальныя), дэманстрацыі ключавых слоў ці паняццяў.

Актывізацыя ўвагі навучэнцаў — вельмі важны момант урока. З гэтай мэтай можна скарыстаць матывацыйнае відэа. Гэта вельмі кароткі відэаролік, які дэманструецца на пачатку ўрока ці вывучэння новай тэмы або новага матэрыялу. Такое відэа прыцягне ўвагу навучэнцаў, зацікавіць іх, уключыць у актыўную супольную дзейнасць. У кароткім відэа можна ўвасобіць ідэю, якая будзе асэнсоўвацца на працягу ўсяго ўрока.

Напрыклад, да першага ўрока па вывучэнні твора «Паром на бурнай рацэ» можна прапанаваць вучням невялікі матывацыйны відэаролік (*https://youtu.be/Jj1wTQXQ01Q*, гл. QR-код). Такім відэа актывізую ўвагу васьмікласнікаў, яны з большай ахвотай чытаюць мастацкі тэкст.

Вучэбная праграма па беларускай літаратуры змяшчае творы рознага часу напісання. У некаторых з іх ідзе гаворка пра з'явы і працэсы, не зусім зразумелыя сённяшнім вучням. Для таго каб яны маглі віртуальна наведаць мясціны, у якіх не бывалі, прапаную іх увазе відэакантэнт. Пры вывучэнні верша Уладзіміра Караткевіча «Беларуская песня» дэманструю візуалізаваны твор (*https://youtu.be/-2Fj0Dp624c*). Яго прагляд дапамагае навучэнцам пабачыць названыя ў вершы мясціны Беларусі, больш яскрава ўявіць вобразы паэтычнага твора. Да таго ж тлумачыцца сэнс незразумелых слоў: *кажаны*, *знічкі*, *ралля*.

Відэагісторыя ў малюнках спрашчае для падлеткаў разуменне зместу твора: дае магчымасць прасачыць за развіццём сюжэта,

лепш зразумець абставіны, у якіх апынуліся ці дзейнічаюць героі. Калі мастацкі твор невялікага аб'ёму, можна пачынаць урок з прагляду падрыхтаванага анімацыйнага роліка.

У відэа да ўрока беларускай літаратуры ў сёмым класе па тэме «Змітрок Бядуля. «Шчасце не ў золаце» (*https://youtu.be/mCmXCaD0oX4,* гл. QR-код) спачатку прапануецца тлумачэнне значэння слова «шчасце», далей вучні сочаць за сюжэтам абразка ў анімацыі. Пасля слоў «Ой не пайду за цябе замуж…» на экране з'яўляецца пытанне: «Чаму адмовіла панічу дзяўчына?» Вучні адказваюць на яго. Потым сюжэт ідзе далей. Падлеткі маюць магчымасць супаставіць свае адказы са зместам абразка. Пасля слоў «Не трэба багатага молайца» з'яўляецца яшчэ адно пытанне: «У чым бачыла яна сваё шчасце?» Спачатку адказваюць вучні, затым у кадры фігуруюць радкі з тэксту твора. Як бачым, відэа дапамагае аналізаваць твор.

Асэнсаванню зместу мастацкага твора можа дапамагчы «адтэрмінаваная загадка». Знаёмства з апавяданнем Змітрака Бядулі «На Каляды к сыну» можна пачаць з прагляду відэа (*https://www.youtube.com/watch?v=2-4XJDMnpHM,* гл. QR-код). Пасля слоў «Думала яна аб сыне сваім, які жыве ў вялікім горадзе, думала і цешылася…» можна задаць пытанне: «Як далей будуць развівацца падзеі ў творы?» Вучні прапануюць свае варыянты развіцця сюжэту. Далей яны даведваюцца, як Лаўрук выхоўваўся ў пана Шчубальскага. Наступныя кадры відэа пачынаюцца ад слоў «Ускінула Тэкля хатулачку на плечы, пару лапцей на запас узяла, развіталася з бабамі і пусцілася ў дарогу». Мэтазгодна запытаць вучняў, чаму менавіта напярэдадні Каляд сабралася Тэкля да сына ў госці. *(Каляды — свята, якое звычайна збірала за сталом усю сям'ю. Маці не хапала сына.)* Наступныя кадры відэа паказваюць горад XIX стагоддзя, шумны і непрыветны да старой жанчыны (Тэкля прайшла пешшу 6 міль; тут ездзілі на павозках). Гэта дапаможа падлеткам адказаць на пытанне «Як сустрэў горад Тэклю?» Далейшыя кадры ілюструюць фінальную сцэну апавядання: сын адмовіўся прызнаць і прыняць маці ў сваім доме. Наступны кадр прапануе пытанне: ці была нечаканай такая развязка твора? Яны ўжо ведаюць змест, прасачылі ход падзей, паразважалі над лёсам і паводзінамі персанажаў твора, таму ім няцяжка будзе даць адказ. Такое відэа стварае інтрыгу, падтрымлівае ўвагу вучняў, яны з большым жаданнем і цікавасцю чытаюць тэкст, знаходзячы ў ім адказы.

Відэаролік можна выкарыстаць як літаратурную (лінгвістычную) загадку. На ўроку беларускай літаратуры ў дзявятым класе пры вывучэнні творчасці У. Караткевіча можна прапанаваць вучням відэазагадку (*https://youtu.be/A1xkWb_nx70,* гл. QR-код). Такое відэа дапаможа прыгадаць вывучаныя раней творы пісьменніка, матываваць вучняў на далейшае знаёмства з творчасцю гэтага аўтара.

Выкарыстанне розных каналаў паступлення інфармацыі (слыхавы і зрокавы каналы, маторнае ўспрыманне) станоўча ўплывае на трываласць запамінання матэрыялу. На ўроках беларускай мовы прыдасца відэазагадка з тлумачэннем некаторых нюансаў правапісу змякчальнага мяккага знака (*https://youtu.be/yY-s74XF0hU,* гл. QR-код), якая дапаможа далей наладзіць вывучэнне тэмы. Непрацяглае,

трохі больш за хвіліну, відэа запыніць ўвагу і зацікавіць падлеткаў. Вучням лягчэй будзе пазнаёміцца з тэарэтычным матэрыялам, калі яны будуць абапірацца на папярэднія веды, атрыманыя з дапамогай відэароліка.

Станоўчым момантам выкарыстання відэа ў вучэбным працэсе з'яўляецца падтрыманне цікавасці да вывучэння беларускай мовы. Анімацыю можна выкарыстаць пры вывучэнні тэарэтычнага матэрыялу па беларускай мове. Так, пры тлумачэнні (паўтарэнні, замацаванні) такой фанетычнай з'явы, як падаўжэнне, раім паказаць вучням кароткі відэаролік (*https://youtu.be/Z1eS7xcyBWc*, гл. QR-код). Пры засваенні новага матэрыялу настаўнік можа паставіць відэа на паўзу і прапанаваць запісаць прыклады з відэа, пры паўтарэнні / замацаванні тэмы — дапоўніць іх уласнымі прыкладамі. На передапошнім кадры прапануецца выканаць інтэрактыўнае практыкаванне, створанае на рэсурсе learningapps. Адпаведны QR-код пры гэтым пададзены на экране.

Для працы на ўроку падрыхтаваны відэаматэрыял не абавязкова павінен быць працяглым. У трохххвілінны відэаролік («Класічных формаў вечная краса») можна змясціць дэманстрацыйны матэрыял (тэрміны «элегія», «ода», «раманс», «санет»), міні-тэст для апытвання (суаднесці назвы вершаў, іх аўтараў, вызначыць жанр вершаў), коміксы (займальны матэрыял), дэманстрацыю рыфмоўкі санета, пытанні для аналізу паэтычнага твора (бяруцца з вучэбнага дапаможніка). https://youtu.be/IUD6V-KSUD0

Для таго каб вучні эфектыўна ўспрымалі відэа на ўроку, неабходна, каб яно мела якасны гук і выявы, адпавядала ўзроставым асаблівасцям навучэнцаў, не было занадта доўгім.

Такім чынам, выкарыстанне відэа дапамагае зрабіць урок разнастайным і цікавым, наглядна падаць інфармацыю, якой няма ў вучэбным дапаможніку: дадатковы матэрыял для вывучэння, паўтарэння і інш.

Відэакантэнт падвышае актыўнасць навучання, стварае ўмовы для самастойнай працы навучэнцаў.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

Беларуская мова : [відэакантэнт, распрацаваны спецыялістамі адукацыі Віцебскай вобласці] // Витебский областной институт развития образования. — Режим доступа: *http://voiro.by>деятельность... методическая...беларуская-мова* (урок настаўніцы СШ № 2 г. Віцебска А. У. Шамковай). — Дата доступа: 20.11.2022.

*Казачэнка, І.* Беларуская літаратура ў коміксах / І. Казачэнка // Настаўн. газ. — 2022. — 3 лют. — С. 8.

*Садовина, Л. В.* Применение видеоматериалов в процессе обучения английскому языку / Л. В. Садовина. — Йошкар-Ола : ГБУ ДПО Республики Марий Эл «Марийский институт образования», 2016. — С. 4—10.